## Ведай нашых

# Аляксей Зарыцкі

## (да 100-годдзя са дня нараджэння знакамітага земляка)

## 9.03.1911 - 29.10.1987

*Нарадзіўся я ў Хоцімску, калісь глуш-глухмень...*

Нарадзіўся ў Хоцімску 9 сакавіка 1911 г. у сям'і дробнага служачага. Узнагароджаны 2 ордэнамі Айчыннай вайны 2-й ступені, 5 Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровымі граматамі Літоўскай і Латвійскай ССР, медалямі.

Як паэт дэбютаваў у 1927 г. У 1932 выдаў першы зборнік вершаў «Эпічныя фрагменты». Другое паэтычнае нараджэнне А. Зарыцкага адбылося ў час Вялікай Айчыннай вайны. Вершы, напісаныя ў гэты перыяд, склалі кнігу «Дняпроўскае рэха». У пасляваенны перыяд ішоў інтэнсіўны пошук індывідуальнага стылю. Эпічнасць вершаў захоўвалася і паглыблялася, набываючы пры гэтым прамоўніцкія інтанацыі. Паводле формы вершы набліжаліся да балады. На гэтым этапе вялікую ролю ў творчым лёсе А. Зарыцкага адыгралі А. Куляшоў і вядомы украінскі паэт П. Тычына. Сярэдзінай 50-х г. пазначаны росквіт таленту паэта. Найбольш выразна якасны зрух выявіўся ў ліра - эпічных творах. Адчувальны рост у стварэнні маштабных характараў, напружанага канфлікту, сатырычнай накіраванасці твора («Аповесць пра залатое дно»). Большасць паэм прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны, у якіх у розных аспектах выяўляецца героіка змагання з фашызмам, услаўляецца інтэрнацыянальная салідарнасць працоўных, сіла духу, вера ў канчатковую перамогу над фашызмам («Трывожная госця») і інш. Услаўленне ведаў, імкненне да спазнання таямніц сусвету характэрна для паэмы «Вяртанне на Зямлю». Аўтар зборніка апавяданняў на рускай мове «Вераснёвы мёд».

Пяру пісьменніка належыць зборнік успамінаў, крытычных артыкулаў і нарысаў «За словам - падарункам».

**Матэрыял падрыхтавала супрацоўнік музея Наталля ХОЛАДАВА.**

**Холадава, Н.** Аляксей Зарыцкі : да 100-годдзя са дня нараджэння знакамітага земляка / Наталля Холадава // Шлях Кастрычніка. — 2011. — 12 сакавіка. — С. 11.